## Прыметнік
## (Nomen adjectivum)

Лацінскія прыметнікі не маюць асобнага тыпу скланення і скланяюцца як назоўнікі 1-га, 2-га або 3-га скланення. У залежнасці ад скланення прыметнікі падзяляюцца на дзве групы: а) прыметнікі 1—2-га скланення і б) прыметнікі 3-га скланення.

### Прыметнікі 1—2-га скланення

Гэта прыметнікі, якія ў *nom. sg.* заканчваюцца на **-us/-er**, **-a**, **-um**:

| *m* | *f* | *n* |
|---|---|---|
| **-us**<br>**-er** | **-a** | **-um** |
| 2-е скл. | 1-е скл. | 2-е скл. |

З а ў в а г а. Прыметнікі на **-er** у *nom. sg. m* маюць нулявы канчатак.

Напрыклад:
longus, longa, longum — *доўгі* (аснова long-);
liber, libĕra, libĕrum — *свабодны* (аснова libĕr-);
pulcher, pulchra, pulchrum — *прыгожы* (аснова pulchr-).

З а ў в а г а. Аснова прыметнікаў на **-er** вызначаецца па форме жаночага або ніякага роду (libĕr-, pulchr-).

У слоўнікавую форму прыметніка ўваходзіць:
1) поўная форма *nom. sg. m*;
2) канчаткі або частка форм *nom. sg. f*, *n*.
Напрыклад, longus, a, um; liber, ĕra, ĕrum; pulcher, chra, chrum.

**Склонавыя канчаткі**

| Склон | Singulāris | | | Plurālis | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | *m* | *f* | *n* | *m* | *f* | *n* |
| *Nom.* | **us/Ø**[1] | **a** | **um** | **i** | **ae** | **a** |
| *Gen.* | **i** | **ae** | **i** | **ōrum** | **ārum** | **ōrum** |
| *Dat.* | **o** | **ae** | **o** | **is** | | |
| *Acc.* | **um** | **am** | = *nom.* | **os** | **as** | = *nom.* |
| *Abl.* | **o** | **ā** | **o** | **is** | | |
| *Voc.* | **e**/= *nom.*[2] | = *nom.* | = *nom.* | = *nom.* | | |

З а ў в а г і.
1. Нулявы канчатак (-**Ø**) у *nom. sg. m* маюць прыметнікі, якія ў гэтай форме заканчваюцца на -**er**.
2. Прыметнікі на -**us** у *voc. sg. m* маюць канчатак -**e**. У астатніх прыметнікаў *voc. sg. m* = *nom. sg. m*.

**Узор скланення**
**longus, a, um** — ***доўгі*****;**
**pulcher, chra, chrum** — ***прыгожы***

| Склон | Singulāris | | | Plurālis | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | *m* | *f* | *n* | *m* | *f* | *n* |
| *Nom.* | long-**us** | long-**a** | long-**um** | long-**i** | long-**ae** | long-**a** |
| *Gen.* | long-**i** | long-**ae** | long-**i** | long-**ōrum** | long-**ārum** | long-**ōrum** |
| *Dat.* | long-**o** | long-**ae** | long-**o** | long-**is** | | |
| *Acc.* | long-**um** | long-**am** | long-**um** | long-**os** | long-**as** | long-**a** |
| *Abl.* | long-**o** | long-**ā** | long-**o** | long-**is** | | |
| *Voc.* | long-**e** | long-**a** | long-**um** | long-**i** | long-**ae** | long-**a** |

| Склон | Singulāris | | | Plurālis | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | *m* | *f* | *n* | *m* | *f* | *n* |
| *Nom.* | pulcher | pulchr-**a** | pulchr-**um** | pulchr-**i** | long-**ae** | long-**a** |
| *Gen.* | pulchr-**i** | pulchr-**ae** | pulchr-**i** | pulchr-**ōrum** | long-**ārum** | long-**ōrum** |
| *Dat.* | pulchr-**o** | pulchr-**ae** | pulchr-**o** | pulchr-**is** | | |
| *Acc.* | pulchr-**um** | pulchr-**am** | pulchr-**um** | pulchr-**os** | long-**as** | long-**a** |
| *Abl.* | pulchr-**o** | pulchr-**ā** | pulchr-**o** | pulchr-**is** | | |
| *Voc.* | pulcher | pulchr-**a** | pulchr-**um** | pulchr-**i** | long-**ae** | long-**a** |

## Прыналежныя займеннікі
## (Pronomina possessiva)

**meus**, **mea**, **meum** — *мой*
**tuus**, **tua**, **tuum** — *твой*
**vester**, **vestra**, **vestrum** — *ваш*
**noster**, **nostra**, **nostrum** — *наш*
**suus**, **sua**, **suum** — *свой*

З а ў в а г і.
1. Скланяюцца як прыметнікі 1—2-га скланення.
2. Займеннік meus, a, um у *voc. sg. m* мае форму mi.
3. Займеннік suus, a, um ужываецца толькі ў адносінах 3-й асобы.

## Дапасаванне прыметніка
## да назоўніка

Прыметнік дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне, але можа адносіцца да іншага скланення. Каб дапасаваць прыметнік да назоўніка, трэба:

1) запісаць назоўнік і вызначыць яго род;

2) са слоўнікавай формы прыметніка выбраць форму адпаведнага роду і запісаць яе пасля назоўніка.

П р ы к л а д 1. Наш калега (калега: collēga, ae *m*; наш: noster, tra, trum).
*Nom. sg.*: collēga noster.
Назоўнік collēga скланяецца па 1-м скланенні, бо ў *gen. sg.* мае канчатак -**ae**.
Форма noster скланяецца па 2-м скланенні, бо гэта форма мужчынскага роду.
*Gen. sg.*: collēgae nostri.

П р ы к л а д 2. Высокая яблыня (яблыня: malus, i *f*; высокі: altus, a, um).
*Nom. sg.*: malus alta.
Назоўнік malus скланяецца па 2-м скланенні, бо ў *gen. sg.* мае канчатак -**i**.
Форма alta скланяецца па 1-м скланенні, бо гэта форма жаночага роду.
*Gen. sg.*: mali altae.

П р ы к л а д 3. Прыгожы храм (храм: templum, i *n*; прыгожы: pulcher, chra, chrum).
*Nom. sg.*: templum pulchrum.
Назоўнік templum скланяецца па 2-м скланенні, бо ў *gen. sg.* мае канчатак -**i**.
Форма pulchrum скланяецца па 2-м скланенні, бо гэта форма ніякага роду.
*Gen. sg.*: templi pulchri.